В.М.САСНОЎСКІ, А.А.КАЛАСОЎСКІ, М.Л.СТРАХА

# ПРАКТЫКУМ

# ПА ЭКАНАМІЧНАЙ І САЦЫЯЛЬНАЙ ГЕАГРАФІІ БЕЛАРУСІ

(для студэнтаў факультэта прыродазнаўства спецыяльнасці 1 -02 04 05 “Геаграфія. Дадатковая спецыяльнасць”)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск – 2011

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ………………………………………………………………………. 3

МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЛАБАРАТОРНЫХ ЗАНЯТКАЎ………………………. 6

МАТЭРЫЯЛЫ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ…………………………..28

МАТЭРЫЯЛЫ ДА САМАСТОЙНАЙ КІРУЕМАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ……………………………………………………………………..32

ПРЫКЛАДЫ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ……………………………………34

ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА КУРСАВЫХ РАБОТ……………………37

ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ……………39

ЛІТАРАТУРА………………………………………………………………44

ДАДАТКІ……………………………………………………………………46

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная дысцыпліна “Эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі” з’яўляецца адной з важнейшых у падрыхтоўцы настаўніка геаграфіі. Галоўныя яе мэты – сфарміраваць ў студэнтаў цэласнае геаграфічнае ўяўленне аб сацыяльна-эканамічным становішчы сваёй краіны, яе месцы ў сучасным свеце, а таксама выявіць наяўнасць адрозненняў у гаспадарчай дзейнасці і жыцці насельніцтва рэгіёнаў Беларусі. Асобая роля дысцыпліны вызначаецца яе значным выхаваўчым патэнцыялам, а таксама цеснымі сувязямі вывучаемага зместу з падзеямі, якія адбываюцца штодзённа ў жыцці краіны.

Разам з засваеннем тэарэтычных асноў дысцыпліны  не менш актуальным уяўляецца набыццё практычных навыкаў, якія садзейнічаюць больш глыбокаму асэнсаванню вучэбнага матэрыялу, фарміраванню ўмення выкарыстоўваць тэарэтычныя веды на практыцы і ажыццяўляць самастойна творчы працэс. Важная роля прапануемага практыкума – фарміраванне навыкаў правядзення разлікова-аналітычнай дзейнасці, без якіх цяжка ўявіць сучаснага спецыяліста вышэйшай адукацыі ў галіне геаграфіі. У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам (2008 г.) па дысцыпліне “Эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі” прадугледжана правядзенне 17 лабараторных , 5 семінарскіх заняткаў (34 і 10 гадзін, адпаведна). Значная роля ў засваенні зместу дысцыпліны адводзіцца самастойнай кіруемай рабоце студэнтаў (СКРС). У сувязі з гэтым у практыкуме прапануюцца рэкамендацыі па арганізацыі такой работы, накіраванай на засваенне матэрыялу асобных тэм, вынесеных на самастойнае вывучэнне.

Згодна з тыпавым вучэбным планам, адной з асноўных форм аўдыторнай работы студэнтаў па дысцыпліне “Эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі” з’яўляецца правядзенне лабораторных заняткаў. У межах лабараторных заняткаў студэнты ажыццяўляюць даследчыцкую дзейнасць: аналізуюць статыстычныя і катаграфічныя матэрыялы, выконваюць разліковыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

разлікова-графічныя заданні, фармулююць вывады аб асаблівасцях тэрытарыяльнага ўпарадкавання насельніцтва і гаспадарчай дзейнасці людзей у межах Беларусі. Лабараторныя заняткі праводзяцца па наступнай схеме: спачатку праводзіцца невялікае апытанне па тэме заняткаў з мэтаю праверкі тэарэтычнай падрыхтаванасці студэнтаў да выканання заданняў; пасля выконваюцца індывідуальныя і (або) групавыя разліковыя і разлікова-графічныя заданні; напрыканцы ажыццяўляецца калектыўнае абмеркаванне разгледжаных пытанняў. Трэба падкрэсліць, што асноўны акцэнт робіцца менавіта на індывідуальную разлікова-аналітычную дзейнасць, а прапануемыя пытанні разглядаюцца ў кантэксце гэтай дзейнасці і як інструмент пранікнення ў сутнасць разглядаемых праблем.

На семінарскіх занятках вынесеныя тэмы, звязаныя з комплекснай сацыяльна-эканоміка-геаграфічнай характарыстыкай асобных абласцей Беларусі і г. Мінска. Яны дазваляюць абагульніць і канкрэтызаваць вывучаны раней матэрыял на прыкладзе асобных рэгіёнаў Беларусі. Таму ў межах семінарскіх заняткаў больш грунтоўна разглядаюцца тэарэтычныя пытанні. У той жа час, студэтам прапануецца выканаць асобныя практычныя заданні, неабходныя для больш поўнага засваення матэрыялу тэмы.

Да кожнага з лабараторных і практычных заняткаў прапануецца спіс рэкамендуемых літаратурных крыніц, а таксама неабходныя для разліковай, разлікова-графічнай і аналітычнай дзейнасці статыстычныя матэрыялы (па тэксту ці ў дадатку).

На СКРС вынесена тэма “Прыродна-рэсурсны патэнцыял Беларусі” у аб’ёме 4 г. (2 г. - за кошт лекцыйных і 2 г. – за кошт семінарскіх заняткаў). Такое рашэнне абумоўлена даволі грунтоўным вывучэннем асобных пытанняў гэтай тэмы ў шэрагу іншых вучэбных дысцыплін, якія былі праслуханы студэнтамі раней (геалогія, агульнае землязнаўства, фізічная геаграфія Беларусі, асновы прыродакарыстання і інш.). Прапануюцца агульны план вывучэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэмы, адпаведны спіс літаратуры, варыянты практычных заданняў і, неабходныя неабходныя для выканання заданняў, статыстычныя матэрыялы.

Бягучы кантроль за засваеннем матэрыялу лабараторных і семінарскіх заняткаў ажыццяўляецца шляхам вуснага апытання студэнтаў і тэсціравання; за засваеннем матэрыялу тэмы, вынесенай на СКРС, – шляхам напісання рэфератаў з далейшым субяседаваннем з кожным студэнтам і тэсціравання. У практыкуме прыводзіцца адзін з варыянтаў тэставых заданняў. Напрыканцы практыкума даецца пералік пытанняў для самакантролю засваення зместу дысцыпліны і прыкладная тэматыка курсавых работ. Пытанні для самакантролю ахопліваюць увесь змест дысцыпліны і маюць на мэце праверыць ступень падрыхтаванасці студэнтаў да экзамена. У дадатак вынесены неабходныя для выканання заданняў статыстычныя матэрыялы, а таксама прыклады контурных карт Беларусі і яе абласцей для картаграфавання і аналізу вынікаў зробленых разлікаў.

Практыкум падрыхтаваны аўтарскім калектывам кафедры эканамічнай геаграфіі і аховы прыроды: кандыдатам геаграфічных навук, дацэнтам В.М.Сасноўскім (агульная рэдакцыя, заданні і матэрыялы да лабараторных і семінарскіх заняткаў, дадаткі 1-3, прыклады тэставых заданняў, пытанні для самакантролю ведаў, прыкладная тэматыка курсавых работ); выкладчыкам А.А. Каласоўскім (заданні і матэрыялы да лабараторных заняткаў, дадаткі 4-5, контурныя карты); старшым выкладчыкам М.Л. Страхой (уводзіны, заданні і матэрыялы да лабараторных заняткаў, матэрыялы да СКРС).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# І. МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЛАБАРАТОРНЫХ ЗАНЯТКАЎ (34 г.)

## Заняткі 1 (2 г.)

## Тэма: “РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ У СНД, ЕЎРАПЕЙСКАЙ І СУСВЕТНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ”

**Мэта:** вызначыць месца і ролю Рэспублікі Беларусь у сусветнай супольнасці, даць ацэнку яе эканоміка- і палітыка-геаграфічнага становішча.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Фарміраванне тэрыторыі Беларусі.

2. Беларусь на палітычнай і эканамічнай карце СНД, Еўропы і свету.

3. Ацэнка эканоміка- і палітыка-геаграфічнага становішча краіны і яе рэгіёнаў.

**Індывідуальныя заданні**

1. На падставе даных табліцы 1 разлічыце ўдзельную вагу Беларусі ў агульнай плошчы, насельніцтве, валавым унутранным прадукце СНД, Еўропы і свету.

2. На контурнай карце падпішыце назвы прыгранічных рэгіёнаў краін суседзяў і адміністрацыйныя раёны Беларусі, якія таксама з’яўляюцца прыгранічнымі.

3. Абапіраючыся на Нацыянальны атлас Беларусі, вызначце і адлюструйце ў табліцы 2 ранг усіх абласцей па кожнаму індыкатару іх эканоміка- і палітыка-геаграфічнага становішча.

4. Разлічыце інтэгральны паказчык – ранг вобласці па спрыяльнасці эканоміка- і палітыка-геаграфічнага становішча, як сярэднеарыфметычнае значэнне рангаў па ўсіх разглядаемых індыкатарах.

5. Прааналізуйце атрыманыя вынікі. Вызначце асаблівасці эканоміка- і палітыка-геаграфічнага становішча адміністрацыйных абласцей Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 1. Беларусь у свеце, 2009 г.

| Паказчыкі | Свет | Еўропа | СНД | Рэспубліка Беларусь |
|---|---|---|---|---|
| Валавы ўнутраны прадукт, млрд дол.ЗША (па ППЗ) | 54976 | 13703 | 2269 | 84 |
| Насельніцтва, млн чалавек | 6900 | 670 | 282 | 9,5 |
| Плошча, тыс кв.км | 149000 | 10200 | 21994 | 207,6 |

Табліца 2. Індыкатары ацэнкі эканоміка- і палітыка-геаграфічнага становішча адміністрацыйных абласцей Беларусі

| Індыкатары | Брэсцкая | Віцебская | Гомельская | Гродзенская | Мінская | Магілёўская |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць краін, якія мяжуюць з вобласцю | | | | | | |
| Ранг вобласці | | | | | | |
| Колькасць раёнаў, праз якія праходзяць Крытскія калідоры | | | | | | |
| Ранг вобласці | | | | | | |
| Месца суседніх краін па ІРЧП | | | | | | |
| Ранг вобласці | | | | | | |
| Адлегласць ад абласнога цэнтра да бліжэйшай сталіцы суседніх краін | | | | | | |
| Ранг вобласці | | | | | | |
| Колькасць пунктаў пропуску на дзяржаўнай мяжы | | | | | | |
| Ранг вобласці | | | | | | |
| Колькасць | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| раёнаў, праз якія праходзяць магістральныя трубаправоды | | | | | | |
| Ранг вобласці | | | | | | |
| Адлегласць ад мяжы вобласці да бліжэйшага марскога порту | | | | | | |
| Ранг вобласці | | | | | | |

**Літаратура:** 2, 3, 4, 5, 11, 12, 13, 16.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Заняткі 2-3 (4 г.)

## Тэма: "ГАСПАДАРЧАЯ АСВОЕНАСЦЬ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ЯК ВЫНІК І ФАКТАР ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ГАСПАДАРКІ І НАСЕЛЬНІЦТВА"

**Мэта:** засвоіць сутнасць і асаблівасці ацэнкі гаспадарчай асвоенасці тэрыторыі, выявіць геаграфічныя адрозненні ў гаспадарчай асвоенасці рэгіёнаў краіны.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Гаспадарчая асвоенасць тэрыторыі: сутнасць, віды і паказчыкі.

2. Асаблівасці ацэнкі гаспадарчай асвоенасці тэрыторыі рознага ўзроўню: краіны, адміністрацыйных абласцей і раёнаў.

3. Гаспадарчая асвоенасць тэрыторыі як вынік і фактар тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі і насельніцтва.

**Індывідуальныя заданні**

1. На падставе данных табліцы 3 разлічыце ва ўсіх абласцях: шчыльнасць насельніцтва; шчыльнасць аўтамабільных дарог; шчыльнасць чыгункі; аб'ём

прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі на 1 кв.км тэрыторыі; долю асабліва ахоўных прыродных тэрыторый у агульнай плошчы вобласці.

2. Вызначце рысы падабенства і адрозненні. Растлумачыць прычыны выяўленых адрозненняў.

3. Па даных дадатку 1 разлічыце аб’ём прамысловай прадукцыі на адзінку плошчы і шчыльнасць насельніцтва ва ўсіх раёнах адной з абласцей (на выбар). Атрыманыя вынікі адлюстраваць на карце і зрабіць адпаведныя вывады.

4. Выканайце параўнальны аналіз інтэгральнай гаспадарчай асвоенасці тэрыторыі двух адміністрацыйных раёнаў Беларусі. Растлумачце прычыны выяўленых адрозненняў.

Табліца 3. Агульныя звесткі аб адміністрацыйных абласцях Беларусі, на 1. 01.2010г.

| Вобласці | Тэрыторыя, тыс.кв.км | Насельніцтва, тыс.чалавек | Прадукцыя прамысловасці, млрд.руб. | Прадукцыя сельскай гаспадаркі, млрд.руб. | Працягласць аўтам. дарог агульн.карыстання, тыс.км | Эксплуатацыйная даўжыня чыгункі, км | Плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, га |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 207,6 | 9480,2 | 127315,7 | 26595 | 86,3 | 5511 | 1579 |
| Брэсцкая | 32,8 | 1398,7 | 12014,6 | 4694 | 10,7 | 1062 | 439 |
| Віцебская | 40,0 | 1228,6 | 22500,7 | 3916 | 17,6 | 1203 | 344 |
| Гомельская | 40,4 | 1438,3 | 28164,6 | 3931 | 12,4 | 910 | 212 |
| Гродзенская | 25,1 | 1069,6 | 12178,4 | 4534 | 12,9 | 649 | 262 |
| г.Мінск | 0,3 | 1834,2 | 24293,0 | - | - | - | - |
| Мінская | 39,9 | 1418,9 | 17068,4 | 6174 | 19,4 | 877 | 245 |
| Магілёўская | 29,1 | 1091,9 | 11096,0 | 3346 | 13,3 | 810 | 77 |

**Літаратура:** 3, 4, 9, 12, 13, 17, 22, 23.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Заняткі 4-5 (4 г.)

## Тэма: “САЦЫЯЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БЕЛАРУСІ І ЯГО АЦЭНКА. РЫНАК ПРАЦЫ”

**Мэта:** прасачыць тэндэнцыі сучаснага дэмаграфічнага развіцця краіны і іх рэгіянальныя асаблівасці, выявіць асаблівасці гарадскога і сельскага рассялення; даць ацэнку працоўнага патэнцыяла краіны і рынку працы.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Сацыяльна-дэмаграфічны патэнцыял: сутнасць, дынаміка і асаблівасці фарміравання ў сучасных умовах.

2. Ацэнка дэмаграфічнай сітуацыі: рэгіянальныя асаблівасці, пагрозы дэмаграфічнай бяспекі краіны.

3. Працоўны патэнцыял і рынак працы: іх геаграфічныя асаблівасці.

**Індывідуальныя заданні**

1. Зрабіце пісьмовы аналіз табліцы “Дынаміка колькасці насельніцтва Беларусі за 1897-2010 гады” (дадатак 4).

2. На падставе даных табліцы 4 разлічыце паказчык натуральнага прыросту па абласцях у вызначаныя перыяды часу, пабудуйце адпаведныя графікі і зрабіце іх аналіз.

3. Выкарыстоўваючы даныя дадаткаў 1 і 5, разлічыце і пабудуйце картадыяграмму “Размеркаванне насельніцтва па асноўных узроставых групах па адміністрацыйных раёнах Беларусі, 2009 г., %”. Вызначце рысы падабенства і адрозненні ва ўзроставай структуры насельніцва адміністрацыйных раёнаў Беларусі. Паспрабуйце растлумачыць прычыны выяўленых адрозненняў.

4. На падставе даных табліцы 5 разлічыце і пабудуйце картадыяграму "Размеркаванне занятага насельніцтва па галінах эканомікі ў абласцях Беларусі, 2009 г,%", правядзіце іх аналіз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 4. Паказчыкі натуральнага руху насельніцтва Беларусі, на пачатак года, ‰

| Вобласці | | 1995 г. | 2000 г. | 2005 г. | 2010 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | Нараджальнасць | 9,9 | 9,4 | 9,3 | 11,5 |
| | Смяротнасць | 13,1 | 13,5 | 14,5 | 14,2 |
| Брэсцкая | Нараджальнасць | 11,3 | 10,7 | 10,3 | 12,3 |
| | Смяротнасць | 12,5 | 12,7 | 14,0 | 14,0 |
| Віцебская | Нараджальнасць | 9,1 | 8,5 | 8,2 | 10,2 |
| | Смяротнасць | 14,9 | 15,0 | 16,3 | 16,3 |
| Гомельская | Нараджальнасць | 10,3 | 9,6 | 9,5 | 11,9 |
| | Смяротнасць | 13,6 | 14,0 | 15,0 | 14,9 |
| Гродзенская | Нараджальнасць | 10,4 | 9,3 | 8,9 | 11,6 |
| | Смяротнасць | 13,7 | 14,2 | 16,0 | 15,2 |
| г.Мінск | Нараджальнасць | 9,1 | 9,1 | 9,3 | 11,6 |
| | Смяротнасць | 9,2 | 9,4 | 9,5 | 9,7 |
| Мінская | Нараджальнасць | 9,5 | 9,0 | 9,3 | 11,6 |
| | Смяротнасць | 14,7 | 15,3 | 16,6 | 16,3 |
| Магілёўская | Нараджальнасць | 9,9 | 9,4 | 9,1 | 11,2 |
| | Смяротнасць | 14,0 | 14,8 | 16,0 | 15,4 |

Табліца 5. Размеркаванне занятага насельніцтва па відах эканамічнай дзейнасці ў абласцях, 2009 г., тыс.чал.

| Сферы занятасці | Рэспубліка Беларусь | Брэсцкая | Віцебская | Гомельская | Гродзенская | г.Мінск | Мінская | Магілёўская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго занята ў эканоміцы | 4625,7 | 630,6 | 568,9 | 662,7 | 506,6 | 1076,3 | 672,8 | 507,8 |
| у тым ліку: | | | | | | | | |
| прамысловасць | 1195,1 | 153,0 | 138,4 | 177,6 | 125,9 | 267,0 | 186,6 | 146,6 |
| сельская гаспадарка | 438,4 | 83,9 | 64,8 | 62,8 | 75,1 | 2,5 | 99,9 | 49,4 |
| лясная гаспадарка | 31,0 | 4,7 | 5,3 | 6,3 | 3,6 | 1,1 | 6,3 | 3,7 |
| будаўніцтва | 420,8 | 56,5 | 46,1 | 62,7 | 44,1 | 119,0 | 52,2 | 40,2 |
| транспарт | 288,3 | 45,6 | 38,4 | 41,6 | 28,5 | 73,1 | 34,4 | 26,7 |
| сувязь | 63,4 | 8,2 | 8,8 | 9,7 | 6,5 | 15,3 | 8,0 | 6,9 |
| Гандаль і грамадскае харчаванне | 655,1 | 81,1 | 73,1 | 82,3 | 61,5 | 208,8 | 87,2 | 61,1 |
| матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і збыт | 17,4 | 1,0 | 1,5 | 3,1 | 0,7 | 4,9 | 4,4 | 1,8 |
| жыллёва-камунальная гаспадарка | 211,7 | 27,4 | 30,8 | 32,5 | 22,7 | 42,0 | 27,5 | 28,8 |
| невытворчыя віды бытавога абслугоўвання | 44,7 | 4,2 | 5,3 | 4,8 | 3,9 | 18,6 | 4,1 | 3,8 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| насельніцтва | | | | | | | | |
| ахова здароўя, фізічная культура і сацыяльнае забеспячэнне | 333,9 | 47,2 | 45,0 | 51,4 | 37,5 | 62,5 | 51,5 | 38,8 |
| адукацыя | 446,5 | 63,5 | 59,8 | 68,9 | 52,6 | 89,7 | 59,1 | 52,9 |
| культура і мастацтва | 93,6 | 12,2 | 11,1 | 13,1 | 9,6 | 24,6 | 11,9 | 11,1 |
| навука і навуковае абслугованне | 34,4 | 0,5 | 1,3 | 3,6 | 0,8 | 25,0 | 2,5 | 0,7 |

**Літаратура:** 3, 4, 5, 7, 10, 12, 19.

## Заняткі 6 (2 г.)

## Тэма: ”ВЫТВОРЧЫ, НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ І ІНАВАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛЫ БЕЛАРУСІ”

**Мэта:** выявіць геаграфічныя асаблівасці вытворчага, навукова-тэхнічнага і інавацыйнага патэнцыялаў краіны, даць колькасную і якасную іх ацэнку.

**Пытанні для абмеркавання**

1.Вытворчы патэнцыял: сутнасць, ацэнка, асаблівасці размяшчэння.

2.Навукова-тэхнічны патэнцыял: сутнасць, ацэнка, асаблівасці размяшчэння.

3.Інавацыйны патэнцыял: сутнасць, ацэнка, асаблівасці размяшчэння.

4.Асноўныя падыходы да інавацыйна ўстойлівага і сацыяльна арыентаванага развіцця рэгіёнаў краіны.

**Індывідуальныя заданні**

1. На падставе даных табліц 3 і 6 разлічыце: ўдзельную вагу абласцей і г.Мінска ў агульнай вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі; агульнай колькасці персаналу, які заняты навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі; агульнай колькасці прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку тых, якія ажыццяўляюць інавацыйную дзейнасць; агульнай колькасці занятага насельніцтва Беларусі.

2. Пабудаваць адпаведныя кругавыя дыяграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Правядзіце супастаўленне атрыманых вынікаў і зрабіць вывады адносна асаблівасцей тэрытарыяльнага размерквання навуковага і інавацыйнага патэнцыялу Беларусі.

Табліца 6. Некаторыя паказчыкі, якія характарызуюць навуковы і інавацыйны патэнцыялы рэгёнаў Беларусі, на 1.01.2010 г.

| Вобласці | Колькасць персаналу, які заняты навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі, чалавек | Колькасць даследчыкаў, якія маюць вучоныя ступені, чалавек | Колькасць прамысловых прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць інавацыйную дзейнасць | Колькасць юрыдычных асоб у апрацоўчай прамысловасці (разам з суб'ектамі малога прадпрымальніцтва) | Колькасць занятага насельніцтва, тыс. чалавек | Удзельная вага адгружанай інавацыйнай прадукцыі і аказаных паслуг інавацыйнага характару ў агульнымм аб'ёме адгружанай прадукцыі і аказаных паслуг,% |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 33516 | 3921 | 234 | 12028 | 4625,7 | 9,7 |
| Брэсцкая | 599 | 29 | 48 | 1486 | 630,6 | 4,7 |
| Віцебская | 1070 | 55 | 21 | 1133 | 568,9 | 15,7 |
| Гомельская | 3058 | 156 | 38 | 1102 | 662,7 | 8,7 |
| Гродзенская | 574 | 59 | 29 | 1159 | 506,6 | 9,0 |
| г.Мінск | 24906 | 3267 | 50 | 3822 | 1076,3 | 9,1 |
| Мінская | 2735 | 317 | 32 | 2264 | 672,8 | 8,2 |
| Магілёўская | 574 | 38 | 16 | 1062 | 507,8 | 12,1 |

**Літаратура:** 1, 4, 8,11, 13, 20, 24, 29, 30.

## Заняткі 7-8 (4 г.)

## Тэма: "ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ СТРУКТУРА ГАСПАДАРЧАГА КОМПЛЕКСУ БЕЛАРУСІ"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мэта:** засвоіць сутнасць, формы, узроўні і асаблівасці тэрытарыяльнай арганізацыі і тэрытарыяльнай структуры гаспадаркі Беларусі.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Тэрытарыяльная арганізацыя гаспадаркі: сутнасць, формы і асаблівасці праяўлення ва ўмовах Беларусі.

2. Тэрытарыяльная структура гаспадаркі: сутнасць, элементы і асаблівасці праяўлення на розных рэгіянальных узроўнях.

3. Канцэптуальныя палажэнні рэгіянальнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2015 года.

**Індывідуальныя заданні**

1. На падставе даных дадатку 1 разлічыце: ўдзельную вагу адміністрацыйных раёнаў у агульнай вытворчасці прамысловай прадукцыі, у агульным аб'ёме інвестыцый у асноўны капітал, у агульнай колькасці насельніцтва Беларусі.

2. Правядзіце тыпалогію раёнаў па адпаведных паказчыках і зрабіць вывады.

3. Карыстаючыся матэрыяламі Нацыянальнага атласа Беларусі вызначце асноўныя элементы тэрытарыяльнай структуры гаспадаркі краіны: буйнейшыя заспадарчыя цэнтры, вузлы, восі эканамічнага развіцця краіны. Ахарактарызуйце асаблівасці іх тэрытарыяльнага размеркавання.

**Літаратура:** 4, 8, 12, 14, 16, 20, 21, 23, 25, 27.

## Заняткі 9 (2 г.)

## Тэма: "ПАЛІЎНА-ЭНЕРГЕТЫЧНЫ КОМПЛЕКС БЕЛАРУСІ (ПЭК)"

**Мэта:** прасачыць тэрытарыяльныя змены ў развіцці паліўна-энергетычнага комплексу Беларусі, правесці аналіз паліўнага балансу і электрабалансу краіны, удасканаліць навыкі графічнага і картаграфічнага адлюстравання эканамічных з'яў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пытанні для абмеркавання**

1. Структура і роля паліўна-энергетычнага комплексу ў эканоміцы краіны.

2. Паліўная прамысловасць, структура паліўнага баланса.

3. Электраэнергетыка краіны, структура энэргабаланса.

4. Праблемы і перспектывы развіцця ПЭК.

**Індывідуальныя заданні**

1. Пабудуйце структурна-лагічную схему ПЭК Беларусі.

2. Абапіраючыся на Нацыянальны атлас Беларусі (с. 189), умоўнымі знакамі нанясіце на контурную карту і падпішыце: нафтаперапрацоўчыя заводы; газа- і нафтаправоды, нафтапрадуктаправоды; буйнейшыя торфазаводы; электрастанцыі (з указаннем іх магутнасці).

3. На ўрэзцы карты з дапамогай лінейных графікаў адлюструйце дынаміку здабычы асобных відаў паліва (табліца 8).

4. На падставе даных табліцы 7 пабудуйце дыяграмы дынамікі і структуры электрабаланса краіны, зрабіце аналіз.

Табліца 7. Электрабаланс Беларусі, мільярдаў кілават-гадзін

| Паказчыкі | 1990г. | 1995г. | 2000г. | 2005г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Выраблена электраэнергіі | 39,5 | 24,9 | 26,1 | 31,0 | 30,4 |
| Атрымана электраэнергіі з іншых дзяржаў | 14,2 | 10,1 | 10,0 | 9,1 | 8,4 |
| Спажыта электраэнергіі | 49,0 | 32,1 | 33,3 | 35,0 | 34,9 |
| у тым ліку: | | | | | |
| прамысловасцю і будаўніцтвам | 27,5 | 13,8 | 16,0 | 17,0 | 16,4 |
| сельскай гаспадаркай | 7,0 | 4,8 | 3,9 | 3,2 | 3,4 |
| транспартам | 3,1 | 1,8 | 1,9 | 2,1 | 1,6 |
| іншымі галінамі | 7,1 | 8,1 | 8,1 | 9,1 | 10,0 |
| страты ў электрасетках агульнага карыстання | 4,3 | 3,6 | 3,4 | 3,6 | 3,5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Адпушчана электраэнергіі за межы рэспублікі | 4,7 | 2,9 | 2,8 | 5,1 | 3,9 |

Табліца 8. Здабыча асобных відаў паліва ў РБ

| Віды прадукцыі | 1990 г | 1995 г | 2000 г | 2005 г | 2009 г |
|---|---|---|---|---|---|
| Вытворчасць першасных энергарэсурсаў у пераліку на ўмоўны эквівалент, млн. т умоўнага паліва | 5,4 | 4,9 | 5,0 | 5,4 | 5,3 |
| Нафта, тыс. т | 2054 | 1932 | 1851 | 1785 | 1720 |
| Спадарожны газ, млн. $м^3$ | 297 | 266 | 257 | 228 | 205 |
| Паліўны торф (умоўнай вільготнасці), тыс. т | 3438 | 3145 | 2002 | 2307 | 2212 |

**Літаратура:** 4, 5, 8, 12, 13, 20, 29.

## Заняткі 10 (2 г.)

## Тэма: “МАШЫНАБУДАУНІЧЫ КОМПЛЕКС БЕЛАРУСІ”

**Мэта:** выявіць асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння розных частак комплексу, вызначыць змяненні ў яго структуры і ўсвядоміць іх прычыны.

**Пытанні для абмеркавання**

1.Склад і роля машынабудаўнічага комплексу ў эканоміцы краіны.

2.Перадумовы і асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння важнейшых элементаў комплексу.

3.Праблемы і перспектывы развіцця машынабудавання і металаапрацоўкі краіны.

**Індывідуальныя заданні**

1. На падставе даных табліцы 9 пабудуйце графікі дынамікі вытворчасці асноўных відаў прадукцыі машынабудавання (станкі, аўтобусы, аўтамабілі, трактары, кормаўборачныя камбайны, тэлевізары, гадзіннікі, халадзільнікі і маразільнікі, матацыклы, веласіпеды), правядзіце іх аналіз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

2. Нанясіце на контурную карту цэнтры металургіі і машынабудавання Беларусі, зрабіце вывады аб асаблівасцях іх размяшчэння.

3. Выкарыстоўваючы статыстычны зборнік “Регионы Республики Беларусь” (2010 г.), вызначце тэрытарыяльную структуру вытворчасці галоўных відаў прадукцыі машынабудавання.

4. На падставе праведзеных разлікаў, запоўніце табліцу 10, уключыўшы ў яе віды прадукцыі, вытворчасць якіх у дадзенай вобласці перавышае 25% ад агульнарэспубліканскага аб'ёму вытворчасці. Зрабіце высновы аб асаблівасцях машынабудаўнічай спецыялізацыі абласцей Беларусі.

5. Па даных табліцы 11 прааналізуйце дынаміку вытворчасці асноўных відаў металургічнай прадукцыі. Вызначце змяненні ў структуры вытворчасці гэтай прадукцыі і растлумаце іх прычыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 9. Вытворчасць асноўных відаў прадукцыі машынабудавання

| Віды прадукцыі | 1990 | 1995 | 2000 | 2005 | 2009 |
|---|---|---|---|---|---|
| Электрарухавікі пераменнага току, тыс. шт. | 1169 | 211 | 359 | 407 | 386 |
| Металарэжучыя станкі, тыс. шт. | 15,5 | 4,7 | 5,4 | 3,7 | 25 |
| Кавальска-прэсавыя машыны, штук | 1135 | 232 | 129 | 266 | 186 |
| Персанальныя ЭВМ, тыс. шт. | – | 12,9 | 15,0 | 53,2 | 106,2 |
| Тралейбусы, штук | – | 83 | 109 | 147 | 388 |
| Аўтобусы, штук | 999 | 62 | 914 | 1263 | 1514 |
| Грузавыя аўтамабілі, тыс. шт. | 42,0 | 12,9 | 14,7 | 22,3 | 11,5 |
| Трактары, тыс. шт. | 100,7 | 28,0 | 22,5 | 41,5 | 45,3 |
| Мінітрактары, штук | – | 1309 | 266 | 235 | 939 |
| Кормаўборачныя камбайны, штук | 9503 | 1069 | 323 | 254 | 376 |
| Экскаватары, штук | 149 | 60 | 116 | 535 | 1049 |
| Бульдозеры, штук | 226 | 11 | 69 | 57 | 13 |
| Гадзіннікі, млн. шт. | 13,4 | 6,6 | 5,6 | 1,5 | 0,7 |
| Радыёпрыёмныя прылады, тыс. шт. | 979 | 277 | 101 | 13 | 10 |
| Тэлевізары, тыс. шт. | 1302 | 250 | 532 | 1308 | 352 |
| Пральныя машыны, тыс. шт. | 33,1 | 36,9 | 88,1 | 36,7 | 236,4 |
| Халадзільнікі і маразільнікі, тыс. шт. | 728 | 746 | 812 | 995 | 1007 |
| Электрапыласосы, тыс. шт. | – | 6,6 | 1,4 | 2,2 | 14,2 |
| Электрапрасы, тыс. шт. | 47 | 243 | 276 | 179 | 58 |
| Матацыклы, тыс. шт. | 225 | 42 | 37 | 6 | 0,7 |
| Веласіпеды (без дзіцячых), тыс. шт. | 846 | 271 | 586 | 441 | 130 |

Табліца 10. Доля абласцей у вытворчасці важнейшых відаў прадукцыі машынабудавання Беларусі, 2009 г., %

| Віды прадукцыі | Вобласці | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Брэсцкая | Віцебская | Гомельская | Гродзенская | г.Мінск | Мінская | Магілёўская |
| | | | | | | | |

Табліца 11. Вытворчасць асноўных відаў прадукцыі чорнай металургіі (тыс. т.)

| Год | чугуннае ліццё | сталь | гатовы пракат | стальныя трубы | металакорд |
|---|---|---|---|---|---|
| 1985 | 914 | 813 | 264 | 5,9 | - |
| 1990 | 859 | 1112 | 686 | 90,0 | 20,1 |
| 1995 | 193 | 744 | 614 | 12,3 | 25,6 |
| 2000 | 213 | 1623 | 1397 | 37,9 | 49,2 |
| 2001 | 231 | 1611 | 1418 | 42,4 | 49,1 |
| 2002 | 221 | 1607 | 1453 | 76,7 | 48,8 |
| 2003 | 225 | 1694 | 1451 | 95,9 | 66,3 |
| 2004 | 256 | 1920 | 1676 | 109,7 | 77,9 |
| 2005 | 270 | 2076 | 1839 | 108,3 | 78,5 |
| 2006 | 301 | 2297 | 2047 | 134,2 | 86,4 |
| 2007 | 346 | 2387 | 2192 | 147,8 | 87,2 |
| 2008 | 366 | 2660 | 2470 | 145,5 | 95,3 |
| 2009 | 275 | 2449 | 2298 | 107,6 | 68,9 |

**Літаратура:** 1, 3, 4, 5, 11, 12, 13, 16, 20, 22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Заняткі 11-12 (4 г.)

## Тэма: “САЦЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС БЕЛАРУСІ”

**Мэта:** выявіць асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння важнейшых элементаў комплекса; адзначыць зрухі ў яго структуры, якія адбыліся за апошнія гады.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Структура і роля комплекса ў эканоміцы краіны.

2. Асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння важнейшых элементаў комплекса.

3. Праблемы і перспектывы далейшага развіцця комплекса.

**Індывідуальныя заданні**

1. Выкарыстоўваючы даныя табліц 3 і 12, разлічыце ўзровень забяспечанасці насельніцтва жыллём у гарадскіх пасяленнях і сельскіх населеных пунктах (квадратных метраў агульнай плошчы на 1 жыхара) рэгіёнаў, зрабіце вывады.

2. Правядзіце аналіз дынамікі колькасці грамадзян, якія знаходзіліся на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў па абласцях (табліца 13), пабудуйце адпаведныя дыяграмы.

3. Дайце ацэнку ўзроўню забяспечанасці насельніцтва па абласцях і г.Мінску (у разліку на 10000) фізкультурна-спартыўнымі збудаваннямі, бальнічнымі ложкамі, медыцынскім персаналам, адукацыйнымі ўстановамі, аб'ектамі гандлю (табліца 14).

4. Абапіраючыся на Нацыянальны атлас Беларусі (с. 192-193), прааналізуйце структуру лёгкай і харчовай прамысловасці буйнейшых гарадоў краіны. Вызначце асаблівасці размяшчэння асноўных вытворчасцяў гэтых галін прамысловасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 12 Жыллёвы фонд, 2009 г.
(на канец года; мільёнаў квадратных метраў агульнай плошчы)

| Адміністрацыйныя адзінкі | Усяго | У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу | У сельскіх населеных пунктах |
|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 228,2 | 153,1 | 75,1 |
| Брэсцкая | 34,4 | 20,4 | 14,0 |
| Віцебская | 30,2 | 19,7 | 10,5 |
| Гомельская | 34,5 | 22,7 | 11,8 |
| Гродзенская | 28,0 | 16,9 | 11,1 |
| г.Мінск | 36,8 | 36,8 | - |
| Мінская | 36,3 | 17,8 | 18,5 |
| Магілёўская | 28,0 | 18,8 | 9,2 |

Табліца 13.Колькасць грамадзян, якія знаходзіліся на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў (на канец года), тыс.чал.

| Адміністрацыйныя адзінкі | 1995 | 2000 | 2005 | 2009 |
|---|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 623,8 | 568,8 | 564,8 | 793,1 |
| Брэцкая | 92,6 | 91,2 | 89,1 | 110,9 |
| Віцебская | 83,7 | 67,7 | 58,3 | 70,1 |
| Гомельская | 94,3 | 79,3 | 84,9 | 94,9 |
| Гродзенская | 64,7 | 57,3 | 56,9 | 81,8 |
| г.Мінск | 153,0 | 158,9 | 171,2 | 270,3 |
| Мінская | 65,9 | 50,1 | 57,4 | 101,6 |
| Магілёўская | 69,6 | 64,3 | 47,0 | 63,5 |

Табліца 14. Асобныя паказчыкі дзейнасці сацыяльнага комплексу, 2009 г.

| Адміністрацыйныя адзінкі | Усяго фізкультурна-спартыўых збудаванняў | Колькасць бальнічных ложкаў, тыс. | Колькасць урачоў усіх спецыяльнасцеў, чалавек. | Агульнаадукацыйныя ўстановы , (на пачатак навучальнага года) | Колькасць аб'ектаў рознічнай гандлёвай сеткі , адзінак |
|---|---|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 25836 | 107,0 | 49380 | 3719 | 43355 |
| Брэцкая | 3685 | 15,2 | 6068 | 637 | 7381 |
| Віцебская | 4112 | 15,3 | 6039 | 613 | 6350 |
| Гомельская | 4436 | 16,2 | 6275 | 643 | 6376 |
| Гродзенская | 3453 | 12,9 | 6080 | 441 | 5363 |
| г.Мінск | 3687 | 20,2 | 14849 | 259 | 4464 |
| Мінская | 2216 | 15,3 | 5470 | 658 | 7362 |
| Магілёўская | 4247 | 11,9 | 4599 | 468 | 6059 |

**Літаратура:** 1, 3, 4, 5, 11, 12, 13, 16, 20, 22.

## Заняткі 13 (2 г.)

## Тэма: “БУДАУНІЧА-ПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС БЕЛАРУСІ”

**Мэта:** даць уяўленне аб будаўніча-прамысловым комплексе Рэспублікі Беларусь, раскрыць яго ролю ў эканоміцы краіны, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння, кірункі далейшага развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пытанні для абмеркавання**

1. Склад і структура комплекса, яго роля ў эканоміцы краіны.

2. Перадумовы і асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння асноўных элементаў комплекса.

3. Праблемы і перспектывы развіцця комплекса.

**Індывідуальныя заданні**

1. Пабудаваць графікі вытворчасці асноўных відаў будаўнічых матэрыялаў (цэмент, цэгла будаўнічая, зборныя ж/б канструкцыі і вырабы (ЗЖБКіВ), сценавыя сілікатныя блокі і інш.) за 1990-2009 гг. (табліца 15), зрабіце вывады.

2. Абапіраючыся на даныя табліцы 16, прааналізуйце дзейнасць будаўнічай вытворчасці па абласцях; па кожнаму з паказчыкаў пабудуйце адпаведную кругавую дыяграму, зрабіце вывады.

3. На карту Беларусі нанясіце центры вытворчасці цэменту, ЗЖБКіВ, сценавых матэрыялаў (выкарыстайце Нацыянальны атлас Беларусі). Вызначце асноўныя асаблівасці ў размяшчэнні гэтых вытворчасцяў і іх прычыны.

Табліца 15. Вытворчасць асноўных відаў прадукцыі прамысловасці будаўнічых матэрыялаў

| Віды прадукцыі | 1990 | 1995 | 2000 | 2005 | 2009 |
|---|---|---|---|---|---|
| Цэмент, тыс. т | 2258 | 1235 | 1847 | 3131 | 4350 |
| Зборныя жалезабетонныя канструкцыі і вырабы, тыс. $м^3$ | 7424 | 1719 | 1424 | 1884 | 3474 |
| Будаўнічая цэгла, млн. шт. умоўнай цэглы | 2331 | 1109 | 827 | 838 | 977 |
| Сценавыя буйныя бетонныя і сілікатныя блокі (уключаючы бетонныя блокі сцен падвалаў), млн. шт. умоўнай цэглы | 672 | 173 | 139 | 113 | 212 |
| Мяккія дахавыя матэрыялы і ізол, млн. $м^2$ | 140 | 69 | 77 | 18 | 29 |
| Азбестацэментныя лісты (шыфер), млн. умоўных плітак | 451 | 138 | 142 | 146 | 185 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Вапна, тыс. т | 1089 | 453 | 586 | 785 | 900 |
| Нярудныя будаўнічыя матэрыялы, млн. $м^3$ | 75,3 | 20,3 | 17,6 | 23,2 | 33,7 |

Табліца 16 Размяшчэнне будаўнічай вытворчасці па абласцях, 2009 г.

| Адміністра-цыйныя адзінкі | Інвестыцыі ў асноўны капітал, мільярдаў рублёў | Аб'ём выкананых падрадных работ, мільярдаў рублёў | Увод у дзеянне асноўных сродкаў (фондаў) , мільярдаў рублёў |
|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 43377.6 | 22461,2 | 39682,2 |
| Брэсцкая | 6463,7 | 2957,5 | 5752,5 |
| Віцебская | 4731,6 | 2256,8 | 3956,8 |
| Гомельская | 7223,9 | 3283,5 | 5616,1 |
| Гродзенская | 5012,6 | 2513,8 | 4441,3 |
| г.Мінск | 8942,4 | 6616,2 | 9439,6 |
| Мінская | 6834,0 | 2954,4 | 6538,9 |
| Магілёўская | 4029,4 | 1879,0 | 3920,4 |

**Літаратура:** 1, 3, 4, 5, 11, 12, 13, 16, 20, 22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Заняткі 14 (2 г.)

## Тэма: "АГРАРНА-ПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС БЕЛАРУСІ (АПК)"

**Мэта:** выявіць асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння розных элементаў комплексу, усвядоміць змяненні ў яго структуры, зрабіць аналіз тэрытарыяльных адрозненняў у спецыялізацыі сельскай гаспадаркі.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Склад АПК і яго роля ў эканоміцы краіны.

2. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка галін сельскай гаспадаркі: раслінаводства і жывёлагадоўлі.

3. Праблемы і перспектывы развіцця комплекса.

**Індывідуальныя заданні**

1. Абапіраючыся на даныя статыстычнага зборніка “Регионы Республики Беларусь” (2010 г.), пабудуйце кругавыя дыяграмы структуры пасяўных плошчаў па абласцях, зрабіце вывады.

2. Разлічыце ўдзельную вагу (у %) рэгіёнаў у вытворчасці асноўных відаў прадукцыі сельскай гаспадаркі Беларусі (збожжа, лёну, цукровых буракоў, бульбы, гародніны, мяса, малака, яек), правядзіце аналіз.

3. Пабудуйце картаграмы, на якіх адлюструйце ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур, бульбы, гародніны, ільновалакна, цукровых буракоў у сельскагаспадарчых арганізацыях адміністрацыйных раёнаў (заданне можа выконвацца па варыянтах). Вызначце асноўныя адрозненні і зрабіце вывады.

4. Пабудуйце картаграмы, на якіх адлюструйце асноўныя паказчыкі прадукцыйнасці жывёлагадоўлі у сельскагаспадарчых арганізацыях адміністрацыйных раёнаў. Вызначце асноўныя адрозненні і зрабіце вывады.

**Літаратура:** 4, 8, 12, 14, 16, 20, 21, 23, 25, 27.

## Заняткі 15-16 (4 г.)

## Тэма: “РАЯНІРАВАННЕ БЕЛАРУСІ І ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ЯЕ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАГА ДЗЯЛЕННЯ”

**Мэта:** усвядоміць важнасць раяніравання і раёнаўтварэння як метада даследавання комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі грамадства і яго прадукцыйных сіл, выявіць асаблівасці сучаснага раяніравання Беларусі і неабходнасць удасканалення яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Раяніраванне: сутнасць, віды і асаблівасці правядзення ва ўмовах Беларусі.

2. Аналіз сучасных канцэпцый (схем) раяніравання Беларусі.

3. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел краіны і неабходнасць яго ўдасканалення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Індывідуальныя заданні**

1. На падставе даных дадатку 2 адлюстраваць на контурнай карце: ўсе тыпы функцыянальна-планіровачных раёнаў Дзяржаўнай схемы комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Рэспублікі Беларусь (2007 г.); колькасць гарадскіх і сельскіх населеных пунктаў у кожным адміністрацыйным раёне; адлегласць райцэнтраў да абласных цэнтраў у межах кожнай вобласці.

2. Па даных табліц 3 і 17 разлічыць па кожнай вобласці: сярэднюю плошчу адміністрацыйных раёнаў; сярэднюю іх велічыню па колькасці насельніцтва; колькі прыпадае гарадскіх пасяленняў, сельскіх Саветаў і сельскіх населеных пунктаў на адзін раён. Прааналізаваць зробленыя разлікі і зрабіць вывады.

Табліца 17. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне Рэспублікі Беларусь на 1 студзеня 2010 года

| Адміністрацыйныя адзінкі | Раёны | Гарады | Раёны ў гарадах | Пасёлкі гарадскога тыпу | Сельскія Саветы | Сельскія населеныя пункты |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 118 | 112 | 24 | 94 | 1339 | 23501 |
| Вобласці: Брэсцкая | 16 | 21 | 2 | 8 | 219 | 2167 |
| Віцебская | 21 | 19 | 3 | 24 | 200 | 6329 |
| Гомельская | 21 | 18 | 4 | 17 | 260 | 2422 |
| Гродзенская | 17 | 14 | 2 | 17 | 178 | 4335 |
| г.Мінск | - | 1 | 9 | - | - | - |
| Мінская | 22 | 24 | - | 19 | 290 | 5206 |
| Магілёўская | 21 | 15 | 4 | 9 | 192 | 3042 |

**Літаратура:** 1, 3, 4, 8, 12, 14, 16, 21, 23, 27, 28.

## Заняткі 17 (2 г.)

## Тэма: “САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНОМІКА-ГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЎНУТРЫРЭСПУБЛІКАНСКІХ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мэта:** выявіць месца і ролю абласцей і г.Мінска ва ўнутрырэспубліканскім падзеле працы, асаблівасці сучаснага і перспектывы далейшага іх сацыяльна-эканамічнага развіцця і ўнутрыабласныя адрозненні.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Месца і роля ўнутрырэспубліканскіх рэгіёнаў (абласцей і г.Мінска) у нацыянальнай і сусветнай эканоміцы.

2. Адрозненні ў перадумовах сацыяльна-эканамічнага развіцця ўнутрырэспубліканскіх рэгіёнаў.

3. Асаблівасці галіновай і тэрытарыяльнай структуры гаспадаркі рэгіёнаў Беларусі.

4. Праблемы і перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей і г.Мінска.

**Індывідуальныя заданні**

1. Па даных табліцы 18 вызначыце спецыялізацыю прамысловасці абласцей і г.Мінска ва ўнутрырэспубліканскім падзеле працы.

2. На падставе даных табліцы 19 правядзіце аналіз магчымасцей гаспадарчага развіцця абласцей Беларусі з улікам іх прыродна-рэсурснага патэнцыялу.

Табліца 18. Галіновая структура прамысловасці рэгіёнаў і асобныя паказчыкі іх удзельнай вагі ў эканоміцы краіны, на 1.01.2010 г., %

| | Брэсцкая | Віцебская | Гомельская | Гродненская | г.Мінск | Мінская | Магілёўская | РБ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Уся прамысловасць | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 1000 | 100 |
| электраэнергетыка | 7,4 | 10,7 | 4,8 | 5,2 | 10,6 | 0,4 | 6,9 | 7,5 |
| паліўная | 0,3 | 47,6 | 48,3 | 0,3 | 0,8 | 0,5 | 0,1 | 21,3 |
| чорная металургія | 0,8 | 0,3 | 11,8 | 0,5 | 0,4 | 1,6 | 1,4 | 4,1 |
| хімічная і нафтахімічная | 3,8 | 11,6 | 4,2 | 21,2 | 5,1 | 25,1 | 27,6 | 12,1 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| машынабудаванне і металаапрацоўка | 20,2 | 5,7 | 11,2 | 13,1 | 51,9 | 22,9 | 21,1 | 21,0 |
| лясная, дрэваапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая | 9,3 | 1,8 | 3,3 | 5.4 | 2,6 | 6,3 | 4,1 | 3,2 |
| прамысловасць будаўнічых матэрыялаў | 8,7 | 2,6 | 2,5 | 9.8 | 6,2 | 5,3 | 9,6 | 4,0 |
| лёгкая | 6,3 | 5,4 | 1,2 | 5.6 | 3,8 | 3,2 | 5,5 | 3,8 |
| харчовая | 35,7 | 10,5 | 9,0 | 30.1 | 13,9 | 26,5 | 18,8 | 17,6 |
| іншыя галіны прамысловасці | 7,5 | 3,8 | 3,7 | 8,8 | 4,7 | 8,2 | 4,9 | 5,4 |
| Удзельная вага ў агульнай колькасці насельніцтва краіны | 14,7 | 13,0 | 15,2 | 11,3 | 19,3 | 15,0 | 11,5 | 100 |
| Удзельная вага ў агульнай прамысловай вытворчасці краіны | 9,4 | 17,7 | 22,1 | 9,6 | 19,1 | 13,4 | 8,7 | 100 |
| Удзельная вага ў агульным аб'ёме інвестыцый у асноўны капітал краіны | 14,9 | 10,9 | 16,7 | 11,6 | 20,7 | 15,8 | 9,4 | 100 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 19. Некаторыя паказчыкі прыродна-рэсурснага патэнцыялу абласцей Беларусі

| Вобласці | Балансавыя запасы мінеральнай сыравіны | | | | Натуральныя рэсурсы падзем-ных вод, $км^3$/год | Сярэднія шматгадавыя характарыстыкі рачнога сцёку, $км^3$/год | Агульны запас драўніны, 2009 г., млн.$м^3$ | Сярэднія эксплуатацыйна-экалагічна чыстыя запасы асноўных відаў дзікарослых пладова-ягадных раслін у лясах Мінлясгаса РБ | Эксплуатацыйныя экалагічна чыстыя рэсурсы асноўных відаў лясных ядомых грыбоў у лясах | Прамысловая рыбапрадукцыйнасць вадаёмаў (азёр, вадасховішчаў і рэк), кг на 1га (км) | Сума актыўных тэмператур паветра вышэй 10°С | Сума ападкаў за перыяд з тэмпе-ратурай вышэй 10°С, мм |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Гліны, суглікі і супескі, млн.т | Пяскі будаўнічыя, млн.$м^3$ | Жвірова-пяшчаныя пароды, млн.$м^3$ | Мел, млн.т | | | | | | | | |
| Брэсцкая | 47,1 | 100,7 | 66,8 | 81,4 | 1,58 | 12,7 | 191,1 | 1876 | 3,8 | 86,3 | 2472 | 333 |
| Віцебская | 92,2 | 66,4 | 238,7 | - | 3,36 | 18,1 | 269,5 | 2745 | 4,6 | 14,5 | 2164 | 340 |
| Гомельская | 37,9 | 82,9 | - | 3,6 | 1,93 | 31,5 | 323,4 | 3789 | 4,3 | 189,4 | 2437 | 331 |
| Гродзенская | 19,9 | 41,1 | 90,4 | 49,8 | 2,62 | 9,6 | 158,6 | 3258 | 3,2 | 29,4 | 2267 | 340 |
| Мінская | 58,7 | 86,1 | 252,6 | 17,0 | 4,13 | 7,6 | 286,4 | 6898 | 6,3 | 27,4 | 2270 | 335 |
| Магілёўская | 7,7 | 104,8 | 41.8 | 54,3 | 2,28 | 14,6 | 205,8 | 1891 | 2,9 | 53,9 | 2259 | 324 |
| Рэспубліка Беларусь | 263,5 | 482,0 | 690,3 | 206,1 | 15,9 | 57,9 | 1434,8 | 20457 | 25,1 | 108,0 | 2306 | 334 |

**Літаратура:** 1, 3, 4, 6, 10, 12, 13, 19, 20, 23, 26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## II. МАТЭРЫЯЛЫ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ (8 г.)

### Заняткі 1 (2 г.)

### Тэма: “КОМПЛЕКСНАЯ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНОМІКА-ГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БРЭСЦКАЙ І ГРОДЗЕНСКАЙ АБЛАСЦЕЙ”

**Мэта:** выявіць асаблівасці сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей і адміністрацыйных раёнаў, вызначыць рысы падабенства і адрозненняў.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Перадумовы сацыяльна-эканамічнага развіцця Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

2. Адметныя рысы прыродна-рэсурснага і сацыяльна-дэмаграфічнага патэнцыялаў.

3. Асаблівасці сучаснага развіцця і размячшэння прадукцыйных сіл рэгіёна.

4. Параўнальная характарыстыка развіцця і размяшчэння асобных галін гаспадаркі.

5. Унутрыабласныя адрозненні. Ацэнка ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця адміністрацыйных раёнаў абласцей.

6. Асноўныя праблемы і перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей.

**Заданні**

На падставе даных дадатку 1 разлічыце сярэднедушавую вытворчасць прамысловай прадукцыі ва ўсіх адміністрацыйных раёнах абласцей і адлюструйце гэты паказчык на карце ў выглядзе картаграмы. Прааналізуйце атрыманыя вынікі і зрабіце высновы адносна прычын выяўленых адрозненняў ва ўзроўні прамысловага развіцця адміністрацыйных раёнаў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура:** 4, 8, 12, 14, 16, 20, 21, 23, 25, 27.

## Заняткі 2 (2 г.)

## Тэма: "КОМПЛЕКСНАЯ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНОМІКА-ГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ВІЦЕБСКАЙ І МАГІЛЁЎСКАЙ АБЛАСЦЕЙ"

**Мэта:** выявіць асаблівасці сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей і адміністрацыйных раёнаў, вызначыць рысы падабенства і адрозненняў.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Перадумовы сацыяльна-эканамічнага развіцця Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

2. Адметныя рысы прыродна-рэсурснага і сацыяльна-дэмаграфічнага патэнцыялаў.

3. Асаблівасці сучаснага развіцця і размячшэння прадукцыйных сіл рэгіёна.

4. Параўнальная характарыстыка развіцця і размяшчэння асобных галін гаспадаркі.

5. Унутрыабласныя адрозненні. Ацэнка ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця адміністрацыйных раёнаў абласцей.

6. Асноўныя праблемы і перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей.

**Заданні**

На падставе даных дадатку 1 разлічыце сярэднедушавую вытворчасць прамысловай прадукцыі ва ўсіх адміністрацыйных раёнах абласцей і адлюструйце гэты паказчык на карце ў выглядзе картаграмы. Прааналізуйце атрыманыя вынікі і зрабіце высновы адносна прычын выяўленых адрозненняў ва ўзроўні прамысловага развіцця адміністрацыйных раёнаў Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура:** 4, 8, 12, 14, 16, 20, 21, 23, 25, 27.

**Заняткі 3 (2 г.)**

**Тэма: "КОМПЛЕКСНАЯ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНОМІКА-ГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ГОМЕЛЬСКАЙ І МІНСКАЙ АБЛАСЦЕЙ"**

**Мэта:** выявіць асаблівасці сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей і адміністрацыйных раёнаў, вызначыць рысы падабенства і адрозненняў.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Перадумовы сацыяльна-эканамічнага развіцця Гомельскай і Мінскай абласцей.

2. Адметныя рысы прыродна-рэсурснага і сацыяльна-дэмаграфічнага патэнцыялаў.

3. Асаблівасці сучаснага развіцця і размячшэння прадукцыйных сіл рэгіёна.

4. Параўнальная характарыстыка развіцця і размяшчэння асобных галін гаспадаркі.

5. Унутрыабласныя адрозненні. Ацэнка ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця адміністрацыйных раёнаў абласцей.

6. Асноўныя праблемы і перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця абласцей.

**Заданні**

На падставе даных дадатку 1 разлічыце сярэднедушавую вытворчасць прамысловай прадукцыі ва ўсіх адміністрацыйных раёнах абласцей і адлюструйце гэты паказчык на карце ў выглядзе картаграмы. Прааналізуйце атрыманыя вынікі і зрабіце высновы адносна прычын выяўленых адрозненняў ва ўзроўні прамысловага развіцця адміністрацыйных раёнаў Гомельскай і Мінскай абласцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура:** 4, 8, 12, 14, 16, 20, 21, 23, 25, 27.

## Заняткі 4 (2 г.)

## Тэма: "КОМПЛЕКСНАЯ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНОМІКА-ГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА МІНСКА"

**Мэта:** выявіць асаблівасці сучаснага сацыяльна-эканамічнга развіцця Мінска.

**Пытанні для абмеркавання**

1. Перадумовы сацыяльна-эканамічнага развіцця горада.
2. Асаблівасці сучаснага развіцця прадукцыйных сіл Мінска
3. Унутрыгарадскія адрозненні. Ацэнка ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця адміністрацыйных раёнаў сталіцы.
4. Асноўныя праблемы і перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця г.Мінска.

**Заданні**

На падставе "Статистического ежегодника г.Минска» (2010 г.) разлічыце сярэднедушавую вытворчасць прамысловай прадукцыі адміністрацыйных раёнаў горада і адлюструйце яе на слупковых дыяграмах; удзельную вагу раёнаў у агульнай вытворчасці прамысловай прадукцыі горада і адлюструйце яе на кругавой дыяграме. Прааналізуйце атрыманыя графічныя матэрыялы і зрабіце высновы адносна асаблівасцей тэрытарыяльнай дыферэнцыяцыі індустрыяльнага развіцця г. Мінска.

**Літаратура:** 4, 8, 12, 14, 16, 20, 21, 23, 25, 27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# III. МАТЭРЫЯЛЫ І ЗАДАННІ ДА САМАСТОЙНАЙ КІРУЕМАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

## Тэма: “ПРЫРОДНА-РЭСУРСНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БЕЛАРУСІ (ПРП)” (4 г.)

**Мэта:** засвоіць сутнасць паняцця “ПРП Беларусі”, даць яго эканоміка-геаграфічную ацэнку, выявіць асаблівасці размяшчэння і выкарыстання асобных элементаў ПРП на тэрыторыі Беларусі.

**Метадычныя рэкамендацыі і індывідуальныя заданні**

Прапануецца наступны план вывучэння матэрыялу тэмы:

1. Сутнасць паняцця “ПРП Беларусі” і яго склад.

2. Прыродныя ўмовы і іх ацэнка для жыцця людзей і гаспадарчай дзейнасці.

3. Прыродныя рэсурсы: геаграфічныя асаблівасці размеркавання і выкарыстання асобных відаў прыродных рэсурсаў:

   3.1. Зямельныя
   3.2. Лясныя
   3.3. Водныя
   3.4. Мінеральна-сыравінныя
   3.5. Рэкрэацыйныя
   3.6.Аграрна-кліматычныя

4. Рацыянальнае прыродакарыстанне як важнейшы накірунак устойлівага развіцця краіны і яе рэгіёнаў.

У якасці задання для выканання ў форме рэферата можа быць прапанавана характарыстыка асаблівасцей размеркавання і выкарыстання асобных відаў прыродных рэсурсаў на тэрыторыі канкрэтнай вобласці ці адміністрацыйнана раёна Беларусі. Напрыклад: “Асаблівасці размеркавання і выкарыстання мінеральна-сыравінных рэсурсаў на тэрыторыі Гомельскай вобласці”, Асаблівасці размеркавання і выкарыстання лясных рэсурсаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па даных дадатку 3 кожны студэнт выконвае дзве картадыяграмы. На першай  павінны быць адлюстраваны ў разрэзе адміністрацыйных раёнаў бал сельскагаспадарчых угоддзяў, лясістасць і валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі на 1 бала-гектар сельгасугоддзяў, на другой - працягласць сонечнага ззяння за год, сярэднегадавая колькасць ападкаў і валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі на 1 бала-гектар сельгасугоддзяў.

